Значная колькасць лацінскіх тэрмінаў трывала замацавалася ў сучасных тэрмінасістэмах беларускай, рускай і іншых еўрапейскіх моў, у першую чаргу з прычыны іх інтэрнацыянальнай семантычнай устойлівасці, інтэрнацыянальнага разумення, што мае першаступеннае значэнне для міжнародна-прававой сферы, арыентаванай на збліжэнне народаў.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1. Булыка, А.М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV- XVII стст. / А.М. Булыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 260 с.
2. Гринев, С.В. Терминологические заимствования (краткий обзор современного состояния вопроса) / С.В. Гринев, Д.С. Лотте //Вопросы заимствования и упорядочения иноязычных терминов и терминоэлементов. – М.: Наука, 1982. – С. 108–35.

УДК 94 (476)

# ІГНАТ ДАМЕЙКА – ВЫДАТНЫ БЕЛАРУСКІ, НАРОДНЫ ГЕРОЙ ЧЫЛІ

*Студэнт – Карлюкевіч І.І., 19 рпт, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя:** «У артыкуле разглядаецца жыццёвы шлях вядомага беларускага вучонага Ігната Дамейкі, яго значэнне навуковай дзейнасці ў сусветнай навуцы і культуры».

**Ключавыя словы:** адукацыя, даследаванне, мінералогія, навуковая дзейнасць, прыродазнаўства, Радзіма.

Беларусь і Чылі, цэнтр Еўропы і захад Лацінскай Амерыкі. Што агульнага паміж такімі далёкімі краінамі? Іх аб’яноўвае адна яскравая асоба – Ігнат Дамейка – сусветна вядомы вучоны, нацыянальны герой Чылі. Чалавек энцыклапедычных ведаў – знакаміты геолаг і мінеролаг, географ і этнолаг, фізік і батанік, біёлаг і металург, мовазнаўца і хімік, педагог і рэфарматар адукацыі.

Ігнат Дамейка паходзіў са старажытнага беларускага шляхецкага роду. Ён нарадзіўся 31 ліпеня 1802 года ў маёнтку Мядзведка Навагрудскага павета Мінскай губерніі (зараз – Карэліцкі раён) ў сям’і былога земскага суддзі Навагрудскага ваяводцва. Скончыў калегію ў Шчучыне, а праз чатыры гады паступіў у Віленскі ўніверсітэт (на фізіка-матэматычны факультэт).

Ва ўніверсітэце ён пасябраваў з будучым вядомым паэтам Адамам Міцкевічам, фалькларыстам Янам Чачотам, паэтам і даследчыкам прыроды Томашам Занам. Яны ўваходзілі ў патаемныя патрыятычныя студэнцкія таварыствы філаматаў і філарэтаў, удзельнікі якіх лічылі сваёй галоўнай мэтай падрыхтоўку моладзі да ўсебаковай дзейнасці на карысць Радзіме.

Аднак ужо ў 1823 годзе, царскія ўлады натрапілі на след філаматаў. Таварыства было разгромлена. Каля сотні маладых людзей былі арыштаваны, кінуты ў турмы, сасланы ў Сібір. І толькі дзякуючы намаганням сваякоў, у студзені 1824 года Ігнат Дамейка быў высланы пад нагляд паліцыі ў вёску Заполле каля Ліды, а затым на Дзятлаўшчыну без права куды б ні было адлучацца і займаць дзяржаўныя пасады. Там Дамейка вымушаны быў займацца гаспадарчымі справамі, рабіў пераклады і нават адкрыў школу для сялянскіх дзяцей і сам вёў у ёй заняткі.

У 1829 годзе паліцэйскі нагляд быў з яго зняты. А праз год Дамейка прыняў удзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1830 года. Як вядома, паўстанне пацярпела паражэнне. Дамейка вымушаны быў назаўсёды пакінуць Радзіму і выехаць на захад, стаўшы эмігрантам на ўсё астатняе жыццё. У 1832 годзе Дамейка разам з Адамам Міцкевічам прыбылі ў Парыж і апынуліся ў самым цэнтры эміграцкага асяродку. Спачатку Дамейка вёў досыць актыўнае палітычнае жыцце, але з цягам часу яго інтарэсы ўсё больш зрушваліся ў бок навукі. Ён пачаў наведваць лекцыі ў школе горнай справы Сарбонскага ўніверсітэта і ў французскай калегіі, займаўся ў Батанічным садзе, удзельнічаў у геалагічных экспедыцыях.

У 1834 годзе Ігнат Іпалітавіч паступіў у вышэйшую горную школу ў Парыжы, якую паспяхова скончыў у 1837 годзе, атрымаўшы дыплом горнага інжынера.

У хуткім часе Дамейка даведаўся, што ў Чылійскай Рэспубліцы, стварыліся ўмовы для асваення і выкарыстання багатых нацыянальных рэсурсаў, але не было патрэбных кваліфікаванных кадраў. Ігнат адразу ж пагадзіўся на падарожжа ў далёкую краіну. Аформіў шасцігадовы кантракт на працу. Не ведаў малады навуковец, калі адпраўляўся за акіян ў 1838 годзе, што тэрмін гэты расцягнецца на 46 гадоў, а Чылі стане для яго другой Радзімай.

Ігнат Дамейка пасяліўся ў невялікім прыморскім мястэчку Какімба, цэнтры горнай прамысловасці Чылі, каб выкладаць у горнай школе Ла-Серэна хімію і мінералогію. Да 1846 года Дамейка чытаў лекцыі, праводзіў разнастайныя даследаванні, камплектаваў мінералагічныя калекцыі, заснаваў фізічную лабараторыю, навуковую бібліятэку, заалагічную калекцыю. У 1845 годзе выпусціў кнігу «Араўканія і яе жыхары» з апісаннем побыту, культуры, мовы індзейцаў араўканаў, перакладзеную ў далейшым на некалькі моў.

Менавіта падчас працы ва ўніверсітэце ва ўсей шырыні і моцы раскрыўся яго талент шматграннага вучонага, даследчыка, арганізатара і

рэфарматара чылійскай адукацыі. У 1852 годзе ён быў прызначаны кіраўніком дэлегацыі па справах вышэйшай школы і з таго часу актыўна займаўся арганізацыяй адукацыі і навучальных устаноў. Ён распрацаваў праект рэформаў школ і ўніверсітэтаў, падрыхтаваў і некалькі разоў выдаваў свае падручнікі па хіміі, фізіцы і мінералогіі, а таксама сваю капітальную працу «Уводзіны ў прыродазнаўчыя навукі».

Адначасова Дамейка працягваў займацца навуковымі даследаваннямі. Ён адзін з першых апісаў геалагічную будову самай сухой пустыні свету Атакамы, вывучаў знойдзены там метэарыт. Ён арганізаваў вывучэнне мінералогіі і геалогіі Андаў і Кардыльераў, у гонар яго ланцуг гор і названы “Кардыльера Дамейка”. Ігнат Дамейка арганізаваў у Сант’яга метэаралагічную службу, увёў у Чылі метрычную сістэму вымярэння. Ён шмат увагі ўдзяляў будаўніцтву шахт і капальняў па здабычы медзі, срэбра і золата. Чылійцы гавораць, што Дамейка першы знайшоў скарбы ў іх зямлі і навучыў імі карыстацца. Дзякуючы яму, горная прамысловасць у Чылі зрабілася вырашальнай і зараз з’яўляецца асновай эканомікі краіны.

У 1866 годзе прадстаўнік навуковай эліты Чылі Ігнат Дамейка ўдзельнічаў у сусветнай выстаўцы ў Парыжы, дзе атрымаў залаты медаль за цудоўную калекцыю мінералаў. А у наступным 1867 годзе яго абралі рэктарам чылійскага ўніверсітэта, на гэтай пасадзе ён працаваў шаснаццаць гадоў. За заслугі перад краінай падчас святкавання трыццацігадовага юбілею навуковай дзейнасці яму было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Чылі», з нагоды чаго быў выбіты памятны медаль.

Удзячныя чылійцы свята захоўваюць памяць пра чылійскага беларуса, выдатнага горнага інжынера, вучонага-прыродазнаўца сусветнага маштабу. Ён абвешчаны народным героем Чылі. У Сант’яга яму ўстаноўлены велічны помнік з надпісам «Вялікі Асветнік», выдадзены яго навуковыя працы ў пяці тамах. Яго імя носіць горад Дамейка, вуліцы ў васьмі гарадах, універсітэт, горны хрыбет, мінерал дамейкіт, адкрытая ім кветка-фіялка дамейкіяна, малюск науцілус дамейкус… А ўсяго ў свеце налічваецца больш за семдзесят такіх назваў. Мала хто можа параўнацца з ім у гэтым сэнсе. Сын беларускай зямлі сваім талентам, працай, розумам стаў сусветна вядомым чалавекам.

Ведаюць, памятаюць і шануюць славутага земляка Ігната Іпалітавіча Дамейку і на яго гістарычнай Радзіме ў Беларусі. Яго імя носяць вуліцы ў Мінску, Навагрудку, Лідзе. У роднай весцы Дамейкі ў яго гонар пасаджана алея, устаноўлены памятны знак з барэльефам асветніка. На месцы родавай сядзібы Дамейкаў у Мядзведцы ўстаноўлены бюст і памятны валун. У Карэлічах традыцыйна праходзяць чытанні, прысвечаныя жыццю і дзейнасці Ігната Дамейкі. У Міры ўстаноўлены надмагільны помнік яго бацьку Іпаліту Дамейку. Пра яго пішуць кнігі і навуковыя артыкулы.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1. Асіноўскі С. Там, дзе цвіце фіялка дамейкіяна / С. Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 2010.– N 6. – С. 142–151.

2. Беларускае замежжа. Белорусское зарубежье. Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. – Мінск, 2010.

3. Мяснікоў А. Незапатрабаваны Бацькаўшчынай беларус / А. Мяснікоў // Полымя. – 2010 – N 7. – С. 166–172.

4. Мазоўка Н. Дамейка Ігнат Іпалітавіч / Н. Мазоўка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 202–203.

УДК 94 (476)

## ЖАНЧЫНЫ Ў ГІСТОРЫІ: АЛЕНА ГЛІНСКАЯ

*Студэнт – Пракаповіч Д.У., 19 рпт, 1 курс ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя:** «У артыкуле разглядаецца жыццёвы шлях вялікай маскоўскай княгіні Алены Глінскай і яе роля ў гісторыі».

**Ключавыя словы:** грашовая рэформа, жанчына, праўленне, пераварот, рэфарматар, цэнтралізацыя ўлады.

На працягу шматвяковай гісторыі многія жанчыны пакінулі сваімі справамі значны, непаўторны след на зямлі. У кожнай з іх было markdown рознае жыццё. Адны з іх нарадзіліся і дзейнічалі на беларускай зямлі, другія паволі лёсу трапілі ў іншыя краіны і праславіліся там.

Папярэднія эпохі падарылі гісторыі нямала выдатных жаночых імёнаў. Сярод іх – Алена Глінская. Яна была дачкой князя Васіля Львовіча з літоўскага роду Глінскіх і яго жонкі Ганны Якшыч, якая паходзіла з сербскага роду.

Глінскія, вядомыя па дакументах з 1437 года, лічылі, што паходзяць ад татарскага цемніка Мамая, унукі якога нібыта атрымалі ў надзел гарадок Глінск. Дзядзька Алены, князь Міхаіл Львовіч, быў буйным дзяржаўным дзеячам вялікага княства Літоўскага. Пасля паражэння бунту Глінскі апынуўся з сям’ёй у Маскве. Сярод бежанцаў была і юная Алена.

У 1526 годзе Алена Глінская была абраная нявестай вялікага князя Васіля III, які развёўся з першай жонкай з прычыны адсутнасці ў яе дзяцей. Алена нарадзіла Васілю дваіх сыноў – Івана і Юрыя.

Пасля смерці свайго мужа ў снежні 1533 года Алена Васільеўна фактычна здзейсніла пераварот, адхіліўшы ад улады назначаных апошняй воляй яе мужа семярых рэгентаў, у тым ліку роднага брата мужа і свайго